# Нашы юбіляры

## ІРАІДА ВОСІПАЎНА ЦАРУК



Споўнілася 80 гадоў доктару гістарычных навук, прафесару Іраідзе Восіпаўне Царук.

І.В. Царук нарадзілася 29 лютага 1928 г. у в. Гаркавічы Сакольскага павета Беластоцкага ваяводства (Польшча). У кастрычніку 1939 г. пераехала ў г. Беласток, дзе вучылася да чэрвеня 1941 г. У 1948 г. скончыла Нясвіжскае педвучылішча і за выдатную вучобу ў ліку 5 % навучэнцаў была накіравана ў БДУ, які скончыла ў 1953 г. Вучылася ў аспірантуры па кафедры гісторыі КПСС універсітэта, паспяхова яе завяршыла ў 1957 г. З 1957 па 1963 г. знаходзілася на партыйнай рабоце. У кастрычніку 1963 г. пераведзена на працу ў БДУ – на кафедру гісторыі КПСС. У 1965 г. І.В. Царук абараніла кандыдацкую, у 1976 г. – доктарскую дысертацыі, якія былі прысвечаны даследаванням гісторыі і культуры Заходняй Беларусі ў 20–30-х гг. XX ст. У 1978 г. ёй прысвоена вучонае званне прафесара. У 1973 г. Іраіда Восіпаўна выбрана на пасаду дэкана гістарычнага факультэта, якую займала да верасня 1986 г. У 1983 г. узначаліла кафедру гісторыі БССР, потым працавала прафесарам гэтай жа кафедры да выхаду на пенсію ў снежні 1991 г. Лекцыі па гісторыі КПСС, гісторыі БССР, гісторыі і культуры Заходняй Беларусі, якія яна чытала, заўсёды выклікалі вялікую цікавасць у студэнтаў. Іраіда Восіпаўна апублікавала каля 100 навуковых прац. Яна падрыхтавала 30 кандыдатаў, шэсць дактароў гістарычных навук.

Вялікая эрудыцыя і аптымізм прыцягвалі да яе людзей самых розных колаў, асабліва студэнцкую моладзь. Іраіда Восіпаўна мела здольнасць вызначаць новыя напрамкі ў навуцы, вылучалася патрабавальнасцю да сябе і іншых, застаючыся пры гэтым уважлівай, добразычлівай і даверлівай у адносінах да людзей.

Яе асабістыя і дзелавыя якасці дапамаглі стварыць на кафедры і факультэце атмасферу творчасці, натхнення, падтрымкі, узаемапавагі і ўзаемаразумення, якія так неабходныя для самарэалізацыі супрацоўнікаў.

Калектыў гістарычнага факультэта сардэчна віншуе Іраіду Восіпаўну з юбілеем, жадае ёй невычэрпнага жыццёвага аптымізму, здароўя і дабрабыту.

***С.М. Ходзін***,
дэкан гістарычнага факультэта
***А.Г. Каханоўскі***,
загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага
і навейшага часу

